# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

3 красавіка 2020 г. № 13 (549)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### На парадку дня



Дэпутаты ратыфікавалі візавае пагадненне з Еўрасаюзам. стар. 2

### Бабоўка як варыянт



Досвед Жлобінскага раёна ацанілі кіраўнікі Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню. стар. 3

### Прэстыж сельскіх прафесій



Будучае вёскі залежыць ад кадраў. Дзе іх браць? стар. 14

### Як знайсці кампраміс?



Капрамонт працягвае заставацца «галаўным болем» для жыхароў шматпавярховак. стар. 14

### Ідзём да кліента!



Па такім прынцыпе працуюць дзяржрэгістратары ў Брэсцкай вобласці. стар. 15


ТЭМА ТЫДНЯ

# Дэмаграфія: рэаліі часу



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Спачатку — добрая навіна. У Беларусі дасягнуты экстрэмальна нізкія паказчыкі дзіцячай і мацярынскай смяротнасці, павялічылася працягласць жыцця. Але пры гэтым дэмаграфічны прырост насельніцтва скарачаецца, і лічбы па нараджальнасці ў найбліжэйшыя гады застануцца нізкія. Менавіта ад такіх паказчыкаў, а таксама ад шэрагу іншых фактараў (ад узроўню бясплоднасці і даступнасці рэпрадуктыўных тэхналогій да ўзроўню развіцця ўсёй медыцыны) залежыць дэмаграфічная сітуацыя ў краіне.**

стар. 13

СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

# КРЭАТЫЎНАСЦЬ І ДЫНАМІЗМ — ТОЕ, ШТО ТРЭБА

Што паказала першая прамая тэлефонная лінія Андрэя БУГРОВА ў якасці новага старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў

### Хто адкажа за брак?

Напярэдадні лініі на інтэрнэт-старонцы Мінгарсавета быў змешчаны аналіз прыёмаў грамадзян дэпутатамі ў 2019 годзе. Згодна з гэтай інфармацыяй большасць (адна трація) зваротаў мінчан датычылася сістэмы гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі, потым ішлі пытанні аховы здароўя, жылля, будаўніцтва і рамонту дарог, абсталявання спартыўных і дзіцячых пляцовак, добраўпарадкавання двароў, прыборкі пад'ездаў, стаянак для асабістага транспарту. На апошнім месцы ў гэтым спісе значыўся капітальны рамонт жылых дамоў.



Аднак падчас тэлефоннай лініі праблематыка капрамонтаў, калі ўлічыць працягласць аповедаў і эмацыянальны настрой тых, хто тэлефанаваў, стала, бадай, галоўнай тэмай. Некаторыя званкі выклікалі справядлівае абурэнне ў старшыні Мінгарсавета. Напрыклад, скарга сталага інваліда на тое, што ён з-за разгільдзяйства рамонтнікаў вымушаны ўжо амаль месяц жыць у непрыстасаваным жыллі без гарачай вады. Хоць у іншых кватэрах яна ёсць. Проста работнікі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бытбудрамонт», якія вядуць капрамонт, дапусцілі брак і не хочуць яго выпраўляць. Акрамя гэтага (нібыта здзекуючыся), яны адключылі ўнітаз ад халоднай вады, і чалавек вымушаны набіраць яе ў пластыкавыя бутэлькі. Сітуацыя ўскладняецца тым, што Дзмітрый Андрэевіч жыве ў кватэры адзін і разлічваць можа толькі на сацыяльнага работніка.

Андрэй Бугроў папрасіў прабачэння ў інваліда з-за выкліканых гора-рамонтнікамі нязручнасцяў і паабяцаў, што літаральна ў найбліжэйшы час яго наведаюць прадстаўнікі гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі і вырашаць пытанне.

стар. 3